**Л.М. Шчур**
(Мазыр, УА “Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверстэт імя І.П. Шамякіна”)
**А. У. Дамасевіч**
(Мазыр, ДУА“Гімназія імя Я. Купалы”)

# КОМПЛЕКС ЭФЕКТЫЎНЫХ ПРЫЁМАЎ ПРАЦЫ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ПЕРШЫМ І ДРУГІМ КЛАСАХ ЯК СРОДАК РАЗВІЦЦЯ ПАЗНАВАЛЬНАГА ІНТАРЭСУ ВУЧНЯЎ

У адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі асноўнымі мовамі навучання і выхавання ў нашай краіне з’яўляюцца беларуская і руская. Дзяржава гарантуе грамадзянам права выбару навучання і выхавання на адной з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь, стварае ўмовы для рэалізацыі гэтага права. Нягледзячы на гэта, на сучасным этапе склалася сітуацыя, калі руская мова займае дамінуючае становішча ў грамадстве. Існуе праблема выхавання нацыянальнай самасвядомасці падрастаючага пакалення праз самабытнасць сваёй мовы, таму што мова – захавальніца культуры і форма яе існавання.

Першыя ўрокі беларускай мовы ў навучальнай установе на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі паказваюць, што лексічны запас вучняў даволі абмежаваны, дзецям цяжка ўспрымаць беларускую мову на слых, яны выказваюць свае думкі па-руску. Педагагічнае назіранне, а таксама гутаркі з бацькамі дазваляюць атрымаць канчатковую карціну: беларуская мова цяжкая для вывучэння і не так запатрабаваная ў паўсядзённым жыцці, як руская і замежныя мовы.

Педагагічная навука даказвае, а практычны настаўніцкі вопыт падцвярджае, што нельга навучыць школьніка, калі ён раўнадушны, абыякавы, не бачыць патрэбы ў набыцці ведаў. І наадварот – добры настрой, зацікаўленасць і жаданне дапамагаюць дасягнуць поспехаў у навучанні.

Намі была пастаўлена мэта: вызначыць эмацыянальны стан вучняў пры вывучэнні беларускай мовы ў першым класе. Даследаванне праводзілася з дапамогай методыкі каляровай дыягностыкі эмацыянальнага стану паводле А.Н. Лутошкіна. Праведзенае даследаванне падцвердзіла назіранні. Большасць вучняў першага класа адчуваюць трывогу (40 %) і страх (24 %) пры вывучэнні беларускай мовы, а радасць і спакой – 12 % і 8 % адпаведна. Дыягностыка таксама выявіла, што ў некаторых вучняў на ўроках беларускай мовы прысутнічае сум і абыякавасць (гл. малюнак 1).



МГПУ им. И.П.Шамякина

У выніку даследавання ўзнікла пытанне аб арганізацыі адукацыйнага працэсу такім чынам, каб дзеці палюбілі ўрокі роднай мовы, праяўлялі цікаўнасць да яе вывучэння, адчувалі задавальненне ад сваёй дзейнасці.

У педагагічнай літаратуры пазнавальны інтарэс вызначаецца як пэўная накіраванасць асобы на галіну пазнання і на сам працэс авалодання ведамі. Гэта накіраванасць напоўнена актыўным замыслам і моцнымі станоўчымі эмоцыямі.




**Малюнак 1. – Вынікі даследавання эмацыянальнага стану вучняў на пачатку першага класа пры вывучэнні беларускай мовы**

На думку Г.І. Шчукінай, фарміраванню пазнавальнага інтарэсу спрыяюць такія групы ўмоў, як змест навучання, працэс пазнавальнай дзейнасці вучняў і адносіны паміж удзельнікамі адукацыйнага працэсу [1]. У адпаведнасці з гэтымі групамі ўмоў мы распрацавалі для ўрокаў беларускай мовы першага і другога класаў комплекс прыёмаў працы, якія забяспечваюць развіццё пазнавальнага інтарэсу вучняў (гл. табліцу).

Табліца – Прыёмы працы на ўроках беларускай мовы

| №п/п | Крытэрыі | Прыёмы працы<br>1 клас | Прыёмы працы<br>2 клас |
|---|---|---|---|
| 1 | Змест навучання | Слуханне казак і гутарка па змесце<br>Маўленчыя размінкі<br>Дыдактычныя гульні<br>Фізкультхвілінкі па змесце ўрока | Стварэнне камунікатыўных сітуацый<br>Маўленчыя размінкі<br>Дыдактычныя практыкаванні<br>Дыдактычныя гульні |
| 2 | Працэс пазнавальнай дзейнасці | Эмацыянальны пачатак урока<br>Стварэнне сітуацыі поспеху на кожным этапе ўрока.<br>Розныя віды чытання:<br>“Вочкі – столь”<br>“Галава – хвост”<br>“Рэха”<br>“Чароўная скарбонка” | Чыстапісанне-разважанне<br>Кадзіраваныя тэсты<br>Праца па алгарытму<br>Складанне апорных схем<br>Сінквейн<br>Кластар<br>Воблака слоў<br>Віктарыны<br>Бліц-апытанні<br>Конкурсы<br>Лексічныя хвілінкі |
| 3 | Зносіны паміж удзельнікамі адукацыйнага працэсу | Стварэнне станоўчага эмацыянальнага клімату<br>Гульні ў парах<br>Рэфлексія вучэбнай дзейнасці | Стварэнне станоўчага эмацыянальнага клімату<br>Гульні ў парах<br>Праца ў групах<br>Рэфлексія вучэбнай дзейнасці |

МГПУ им. И.П.Шамякина

Рэалізацыя гэтага комплекса ў адукацыйным працэсе непасрэдна суправаджалася ўсебаковым аналізам эфектыўнасці пералічаных прыёмаў для развіцця пазнавальнага інтарэсу і павышэння ўзроўню засваення вучэбнага матэрыялу. У выніку намі адабраны тыя прыёмы працы, якія найбольш спадабаліся дзецям, выклікалі іх актыўнасць і зацікаўленасць. Названыя прыёмы прымяняліся ў рознай камбінацыі ў залежнасці ад структуры ўрока [2].

Напрыканцы другога класса была праведзена паўторная дыягностыка, якая выявіла значныя змяненні ў эмацыянальным стане вучняў на ўроках беларускай мовы (гл. малюнак 2).




**Малюнак 2. – Вынікі даследавання эмацыянальнага стану вучняў у канцы другога класа пры вывучэнні беларускай мовы**

Такім чынам, у выніку прымянення на працягу двух гадоў навучання распрацаванага комплекса прыёмаў працы на ўроках беларускай мовы адбыліся значныя змяненні эмацыянальнага стану вучняў: на змену трывозе і страху (64 % вучняў першага класа) прыходзіць спакой, радасць і зацікаленасць (73 % вучняў другога класа). На аснове змянення эмацыянальнага стану назіраецца станочая дынаміка актынасці вучняў на ўроку, і, як вынік, павышэнне якасці ведаў.

## Літаратура


1. Щукина, Г. И. Педагогические проблемы формирования познавательных интересов учащихся / Г. И. Щукина. – М.: Педагогика. – 1988. – 208 с.
2. Дамасевіч, А. У. Беларуская мова. 1 клас: тэматычныя распрацоўкі ўрокаў / А. У. Дамасевіч. – Мазыр: Содействие, 2015. – 176 с.


МГПУ им. И.П.Шамякина